

ПОШТА: АД ЛІЧЫЛЬНІКАЎ З КАСЦЯШКАМІ ДА ІНТЭРНЭТУ **5**

З БАЯНІСТАЎ У ТЭНАРЫ **8**




Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

14 ВЕРАСНЯ 2019 г. СУБОТА № 175 (29042)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Іван ЛАЎРЫНОВІЧ, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гродзенскай вобласці:**

*«З людзьмі неабходна сустракацца, расказваць пра планы па правядзенні тых ці іншых работ. Тлумачыць, як і калі будзе добраўпарадкаваны той ці іншы аб'ект, аргументавана суадносіць спадзяванні людзей з магчымасцямі камунальных службаў, мясцовых уладаў. Калі людзі будуць інфармаваныя, гэта дазволіць пазбегнуць многіх вострых пытанняў. Пры гэтым і жыхарам важна не толькі перакладаць клопат аб прылеглых тэрыторыях на плечы выключна камунальнікаў, але і самім актыўна ўдзельнічаць у навядзенні парадку ў дварах. Калі ўкладзена часцінка сваёй працы, тады і абыякавых адносін да таго, што адбываецца вакол, у жыхароў не будзе. Сумесная праца можа стаць адным з варыянтаў вырашэння многіх праблем».*

# З днём нараджэння, сталіца!




Фота БелТА.

**952** **гады — узрост больш чым сур'ёзны, і адзначаць яго трэба з размахам. Што, уласна, у гэтыя выхадныя Мінск і будзе рабіць. Вялікі горад, сталіца краіны з багатай гісторыяй і разнастайнай сучаснасцю, пакажа сябе ва ўсёй красе.**




Будуць уручаны ўзнагароды найлепшым людзям, паказана гістарычная рэканструкцыя, пажарныя паспаборнічаюць у майстэрстве, а байкеры закрыюць сезон. Атлеты пабягуць паўмарафон, «танкісты» збяруцца на свой фестываль. Будзе шмат музыкі, прысмакаў і забаў... Добрая нагода выйсці ў горад, нягледзячы на абяцанае сіноптыкамі пахаладанне. Пагуляць, паўдзельнічаць у мерапрыемствах. І яшчэ раз пераканацца, якая прыгожая наша сталіца — горад пад жураўліным небам і залатой зоркай.

## КОРАТКА

- **У Беларусі з пачатку года зарэгістравана 199 выпадкаў адру, з іх 56 — прывазныя.**
- Грыбны экафэст «У гасцях у Полацкага Лесуна — 2019» пройдзе сёння ў Полацкім раёне. Больш за 100 камандаў возьмуць там удзел у чэмпіянаце па зборы грыбоў.



- **У Гродне праходзіць VII адкрыты фестываль сыру.**
- Жыхара Брэсцкага раёна прысудзілі да штрафу ў памеры Br5805 за ўхіленне ад выплаты мытных плацяжоў.


ISSN 1990 - 763X


Захапленні

# Ад Судабоўкі да Уладзівастока на «бусліку»,

## або Як вандраваў Генадзь Пузанкевіч, таксідэрміст з Жодзіна

**— О, дык тут вас усе ведаюць! — крычу я ў машыне, уражаная тым, што на працягу ўсёй дарогі да дому Генадзя Канстанцінавіча нас віталі прахожыя — дарослыя і дзеці. Як тут не ведаць, калі побач жыве чалавек, які прывёз з усяго свету матылёў, начаваў у хаціне важака племені ў экзатычнай Інданезіі, а адносна нядаўна сеў на веласіпед і з роднай Судабоўкі (раён Жодзіна) прыехаў... на Далёкі Усход.**

### «На вяршынях снег ляжаў, а я — у тапках...»

Генадзь Пузанкевіч не быў выдатнікам у школе. А вось што яму падабалася, дык гэта пісаць эсэ на вольныя тэмы. Пасля ён пайшоў працаваць лесніком, сам пабудаваў дом-сядзібу, што і цяпер уражвае сваім таямнічым выглядам. Вабіла вандроўка, рух, дзікая прырода. Таму з'явілася жаданне паблукаць па тропіках, пакаштаваць гранат, сарваны з дрэва, пагуляць з лемурамі і паганяцца за матылямі на востраве Цэйлон, Мадагаскары і шмат яшчэ дзе. СТАР. 13

Спецыяльны рэпартаж

# Прыгоды на «Зялёным» пляжы,

## або Як «Звязда» парушальнікаў адпачынку з міліцыяй шукала

**Апошнімі цёплымі дзянькамі многія мінчане стараюцца скарыстацца напоўніцу і па магчымасці адпачыць на прыродзе, хай сабе і ў межах горада. Пры гэтым найчасцей не абыходзіцца без абавязковага атрыбута весялосці — алкаголю, ужываць які ў грамадскіх месцах, да якіх належыць у тым ліку і пляж, забаронена. Патрульныя міліцыянеры пастаянна нагадваюць пра гэта, а яшчэ пра курэнне, забарону знаходзіцца без адзежы ды іншае. На ўсё гэта карэспандэнт «Звязды» нагледзелася ўвечары, патрулюючы разам з праваахоўнікамі пляж «Зялёны» на Цнянскім вадасховішчы.** СТАР. 4

# УПЕРШЫНЮ, АЛЕ ЯК ДОМА

## Візіт наследнага прынца Абу-Дабі надасць дынаміку эканамічным адносінам краін

**Такую думку Аляксандр Лукашэнка выказаў падчас перагавораў з шэйхам Мухамедам бен Заід аль-Нахаянам.**

Наследны прынц Абу-Дабі, намеснік Вярхоўнага галоўнакамандуючага ўзброенымі сіламі Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў, шэйх Мухамед бен Заід аль-Нахаян упершыню прыбыў у Беларусь з афіцыйным візітам. Для яго сустрэчы падрыхтавалі ўрачыстую цырымонію з удзелам роты ганаровай варты і ваеннага аркестра. У выкананні музыкантаў прагучалі гімны абедзвюх краін. Пасля чаго Прэзідэнт і шэйх Мухамед бен Заід аль-Нахаян павіталі членаў афіцыйных дэлегацый і накіраваліся на перагаворы ў камінны зал Палаца Незалежнасці.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што яго з шаноўным госцем звязваюць добрыя, сяброўскія адносіны і ён вельмі рады сустракаць шэйха ў Беларусі. «Вы толькі што сказалі, што вам спадабалася ў Беларусі, спадабаліся нашы людзі. У любы час, на любы тэрмін прыязджайце да нас адпачываць», — запрасіў Прэзідэнт.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, у эканамічных, палітычных і дыпламатычных адносінах паміж краінамі няма ніякіх праблем і спрэчных пытанняў. «Я ўпэўнены: нашы адносіны будуць у такім жа сяброўскім кірунку развівацца», — удакладніў кіраўнік краіны.

Як неаднойчы ўжо заяўляў Прэзідэнт Беларусі, фундаментам любых палітычных адносін з'яўляецца эканоміка і гандаль. У гэтым плане краінам ёсць яшчэ над чым працаваць. Тавараабарот Беларусі і Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў у 2018 годзе склаў 72,3 мільёна долараў ЗША. У студзені — ліпені гэтага года — 55,1 мільёна, пры станоўчым сальда беларускага боку. За мінулы год бізнес ААЭ інвеставаў у беларускую эканоміку 44 мільёны долараў.

«Я ўпэўнены, што ваш цяперашні візіт у Беларусь надасць сур'ёзную дынаміку гандлёва-эканамічным, інвестыцыйным адносінам. Мы знойдзем кірункі нашага супрацоўніцтва. Тым больш закрытых тэм і сфер у адносінах паміж Эміратамі і Беларуссю няма», — канстатаваў Прэзідэнт.

У сваю чаргу шэйх Мухамед бен Заід аль-Нахаян падзякаваў беларускаму боку за шчыры прыём. Ён акцэнтаваў увагу, што пабываў у шматлікіх краінах, але менавіта тут адчувае сябе як дома.

**Марыя ДАДАЛКА.**

**❍ У тэму**

**Шэйх Мухамед бен Заід аль-Нахаян — наследны прынц Абу-Дабі (аднаго з сямі эміратаў ААЭ). З 2005 года займае пасаду намесніка Вярхоўнага галоўнакамандуючага ўзброенымі сіламі Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў. Яго бацька Заід ібн Султан аль-Нахаян быў адным з ініцыятараў стварэння федэрацыі Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў і яе першым прэзідэнтам больш за 30 гадоў. Сёння гэтую пасаду займае старэйшы сын мінулага лідара шэйх Халіфа бен Заід аль-Нахаян.**

Зялёнае багацце

# У АБАРОТ — УВЕСЬ ЛЯСНЫ РЭСУРС

**За першае паўгоддзе арганізацыямі Мінлясгаса былі выкананы ўсе мэтавыя паказчыкі па вытворчасці лясоў. Аб сучасных тэхналогіях вырошчвання, абароны і выкарыстання гэтых рэсурсаў у Беларусі расказаў міністр лясной гаспадаркі Віталь ДРОЖЖА:**



Фота БелТА.

— Асноўная задача для нас на найбліжэйшы час — вытворчасць і поўная рэалізацыя на рынку ў сціслыя тэрміны якаснага пасадачнага матэрыялу, устойлівага да хвароб і асаблівасцяў мікраклімату. У сістэме Мінлясгаса функцыянуе 90 лясных дрэваперапрацоўчых прадпрыемстваў, плануецца павелічэнне іх колькасці. Мы актыўна выкарыстоўваем перадавыя тэхналогіі ў будаўніцтве цяплічнага комплексу па вырошчванні пасадачнага матэрыялу асноўных лесаўтваральных парод, у тым ліку з закрытай каранёвай сістэмай. Такі пасадачны матэрыял рыхтуецца ў Івацэвіцкім і Глыбоцкім лясгасах і ў Рэспубліканскім лясным селекцыйна-насенняводчым цэнтры. Апошні ўключае ў сябе шэсць цяпліц агульнай плошчай 0,86 гектара, якія аснашчаны аўтаматычнымі сістэмамі кантролю паліву, асвятлення і падтрымання мікраклімату. Акрамя таго, маем дзевяць палёў вырошчвання агульнай плошчай 2,25 гектара. Ёсць і корпус з лабараторыяй першаснага кантролю пасадачнага матэрыялу, дзве халадзільныя камеры для яго захоўвання. Фактычны кошт такога аб'екта — 11,9 мільёна рублёў.

Міністр лясной гаспадаркі адзначыў, што будаўніцтва цяплічнага комплексу дасць магчымасць штогод вырабляць да 12 мільёнаў штук стандартнага пасадачнага матэрыялу з закрытай каранёвай сістэмай для аднаўлення і вырошчвання лесу. Выступовец таксама нагадаў, што ў Беларусі плануецца змяненне парадку рэалізацыі драўніны, цяпер рыхтуецца адпаведны праект указа, ён знаходзіцца на завяршальным этапе. Да гадавых таргоў Мінлясгасу неабходна выйсці ўжо з новымі падыходамі. Будаўніцтва пелетных заводаў, якія прыносяць краіне па 20—30 тысяч тон прадукцыі ў год, пераход на рэалізацыю драўніны па еўрапейскіх гарманізуючых стандартах (без яе мэтавага прызначэння) і рэалізацыя нізкаякаснай драўніны на экспарт — ключавыя фактары развіцця лясной прамысловасці ў краіне на сённяшні дзень.

— У наступныя некалькі гадоў па даручэнні Прэзідэнта мы будзем уключаць у гаспадарчы абарот увесь існуючы лясны рэсурс. Мы гаворым не толькі пра нізкаякасную драўніну, але і пра высакаякасную. Хоць, як паказала практыка мінулага года, наша нізкаякасная драўніна больш запатрабаваная ў замежных краінах, чым у Беларусі. Праўда, пакуль што таргі ідуць не вельмі добра: сёлета на экспарт лясгасы рэалізавалі 200 тысяч кубоў нізкаякаснай драўніны. Што датычыцца новых пелетных заводаў, то яны будуць размяшчацца па два ў кожнай вобласці краіны. Шэсць ужо функцыянуюць, яшчэ шэсць будуць запушчаны налета ў чэрвені. Магутнасць дванаццаці прадпрыемстваў дае магчымасць перапрацаваць каля аднаго мільёна кубоў сыравіны. Гэта дазволіць выйсці на комплекснае выкарыстанне адходаў ад лесапілавання, павялічыць валютную выручку. Таксама важным для нас з'яўляецца поўны пераход на гаспадарчы разлік, які плануем ажыццявіць у наступныя некалькі гадоў, — сказаў Віталь Дрожжа.

За апошнія пяць гадоў у сістэме Міністэрства лясной гаспадаркі прасочваецца станоўчая дынаміка паміж высечкай лясоў і іх стварэннем. За першае паўгоддзе арганізацыямі галіны былі выкананы ўсе мэтавыя паказчыкі па аднаўленні і развядзенні лесу — яны былі зроблены на плошчы звыш 40,5 тысячы гектара. Штогадовы аб'ём нарыхтаванай драўніны ў параўнанні з мінулымі гадамі павялічыўся. Напрыклад, у 2016 годзе было нарыхтавана больш за 15 мільёнаў кубаметраў, а ў 2018 годзе — ужо 19,5 мільёна. Асаблівая ўвага аддаецца ўчасткам ляснога фонду, якія пацярпелі ў выніку ўсыхання іглічных насаджэнняў, а таксама ад ураганаў.

— З 2016 да 2019 года лясгасамі галіны былі праведзены санітарна-аздараўленчыя мерапрыемствы з усыхаючымі сасновымі насаджэннямі на плошчы звыш 450 тысяч гектараў. Сёлета фіксуецца зніжэнне інтэнсіўнасці ўсыхання ў большасці рэгіёнаў, — адзначыў міністр лясной гаспадаркі.

**Дырэктар Рэспубліканскага ляснога селекцыйна-насенняводчага цэнтра Уладзіслаў ЦЕЦЯРОНАК** расказаў пра дзейнасць аб'екта:

— Палі на тэрыторыі цэнтра прадугледжаны пад стварэнне лесанасенных плантацый хвоі еўрапейскай, кедра, ясеня і елкі еўрапейскай. Ужо пасеялі плантацыю елкі еўрапейскай — каля 2,5 мільёна штук, 7,5 мільёна штук хвоі звычайнай, а таксама высадзілі першую ў Беларусі плантацыю хвоі кедравай. Каб дасягнуць максімальнага аб'ёму вырошчвання, мы будзем пераходзіць на іншы від касет для расады. цяпер яны стандартныя — на 64 ячэйкі ў адной, такім чынам, у адной цяпліцы атрымліваем 450 тысяч адзінак пасадачнага матэрыялу. Калі пяройдзем на 100 ячэек, — у адной цяпліцы іх стане 750 тысяч. Цяпер цэнтр дае магчымасць вырошчвання каля васьмі мільёнаў штук хвоі і елкі, з павелічэннем ёмістасці касет будзе прыкладна 12 мільёнаў. Вядзецца збыт гэтых лясных культур у Расію, аднак галоўным для нас усё ж такі з'яўляецца забеспячэнне пасадачным матэрыялам лясгасаў краіны. З навінак — сёлета будзем укараняць каліброўку насення для стварэння лясных культур, астатнія плошчы будуць выкарыстоўвацца пад дэкаратыўныя пароды ліcцевых, хвойных дрэў, плантацый буякоў.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Еўропе задумаліся аб стварэнні новай валюты



Міністр фінансаў Францыі Бруна Ле Мэр заклікаў выпрацаваць агульны для ЕС збор правілаў, якія рэгулююць абарот крыптавалют, а таксама стварыць сваю лічбавую валюту. Пра гэта паведаміла Reuters.

Якіх-небудзь падрабязнасцяў аб стварэнні еўрапейскай крыптавалюты Ле Мэр не прывёў. На сустрэчы з еўрапейскімі калегамі ў Хельсінкі ён зноў падкрэсліў, што краінам Еўрасаюза варта адмовіцца ад рэгулявання «крыпты» на нацыянальным узроўні, а таксама выступіў супраць прысутнасці Libra, лічбавай валюты ад Facebook, у Еўропе.

Міністр падкрэсліў, што яна можа выкарыстоўвацца для незаконных аперацый, пагражае фінансавай сістэме і суверэнітэту краін, у якіх будзе выкарыстоўвацца. Як вядома, Facebook абвясціў аб пачатку тэставання ўласнай глабальнай лічбавай валюты Libra сёлета ў чэрвені. Сацсетка ацаніла патэнцыйную кліенцкую базу сваёй крыптавалюты ў 1,7 мільярда чалавек. У наступныя месяцы супраць яе выступілі ўлады шэрагу краін, у тым ліку ЗША і Расіі.

### Нямецкія СМІ заяўляюць аб працягу «дызельгейту»

«Дызельны скандал» вакол нямецкага аўтагіганта Volkswagen можа стаць сур'ёзнейшым, чым лічылася. Па звестках СМІ Германіі, вытворца маніпуляваў праграмным забеспячэннем, якое рэгулюе шкодныя выхлапы, і на дызельным рухавіку ЕА 288 — яго пачалі ўсталёўваць замест рухавіка ЕА 189, з-за якога скандал у 2015 годзе пачаўся ў ЗША. Аўтаканцэрн прызнаў сваю віну. Усяго кампанія выплаціла 33 мільярды долараў у якасці кампенсацый і штрафаў. Тэлеканал «Паўночна-заходняе вяшчанне» (SWR) паведаміў, што аўтавытворца ўсталёўваў на рухавік ЕА 288 так званую прыладу адмены, якая можа вызначыць момант, калі машына праходзіць тэсціраванне на экалагічныя стандарты. Кампанія новыя абвінавачванні абвяргае і заяўляе, што нічога незаконнага не рабіла. Дарэчы, рухавік ЕА 288 з экалагічным стандартам Еўра-6 выкарыстоўваецца ў аўтамабілях кампаніі Volkswagen і яе дачэрніх прадпрыемствах Audi, SEAT і Skoda.

### Колькасць японцаў, якія адзначылі стагадовы юбілей, упершыню перавысіла 70 тысяч



Аб гэтым паведаміла міністэрства аховы здароўя, працы і дабрабыту Японіі напярэдадні дзяржаўнага свята Дня шанавання пажылых людзей. Усяго ў краіне колькасць тых, каму ўжо споўнілася 100 гадоў, склала больш за 71 тысячу чалавек. З іх — 8463 мужчыны, а жанчын — 62,7 тысячы, што складае каля 88 працэнтаў ад агульнай колькасці. Людзей, якія перасягнулі 100-гадовы рубеж, за год стала больш на 1453 чалавекі. Рэкорд штогод абнаўляецца апошнія 49 гадоў. Калі такое даследаванне распачалося ў 1963-м, у Японіі было ўсяго 153 чалавекі, старэйшых за 100 гадоў. Толькі за апошнія 30 гадоў колькасць 100-гадовых вырасла ў 23 разы.

Міністэрства лічыць, што асноўнымі прычынамі даўгалецця з'яўляюцца «прагрэс у тэхналогіях медыцынскага абслугоўвання і намаганні для ўмацавання здароўя». Улады абяцаюць «аказваць падтрымку для таго, каб людзі, нават дасягнуўшы вельмі сталага ўзросту, маглі жыць здаровым, паўнавартасным жыццём».

Наш фармат

# ВОСЕНЬ З ВЯЛІКІМ ТЭАТРАМ:
## аптымістычны «Князь Ігар» і яшчэ пяць прэм'ер

**Свой 87-ы сезон Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Беларусі сустракае ў рабочым рэжыме. Літаральна праз дзень, 15—16 верасня, тут дадуць оперу «Князь Ігар» Аляксандра Барадзіна, у пастаноўцы якой удзельнічае сапраўды магутная творчая каманда: рэжысёр Галіна Галкоўская, мастак Вячаслаў Окунеў, дырыжор Аляксандр Анісімаў, хормайстар Ніна Ламановіч, балетмайстар Юрый Траян.**



Чым будзе адрозніваціа гэты «Князь Ігар» ад дзясяткаў іншых тэатральных пастановак паводле «Слова аб паходзе Ігаравым», зробленых па ўсім свеце, заканамерна пацікавіліся журналісты напярэдадні прэм'еры. «Перадусім музычнай і рэжысёрскай канцэпцыяй», — растлумачыла рэжысёр-пастаноўшчык Галіна Галкоўская, уладальніца медаля Францыска Скарыны. Паводле яе слоў, у спектаклі з'явяцца не толькі ўпершыню адкрытыя для шырокай публікі фрагменты клавіра кампазітара Аляксандра Барадзіна, але і новыя сцэны і персанажы, якіх раней ніхто не бачыў. «На маёй памяці гэта далёка не першы «Князь Ігар», таму ёсць з чым параўноўваць, і без лішняй сціпласці скажу: цяперашні спектакль, мабыць, найлепшы ў маёй кар'еры», — дадае народны артыст Беларусі дырыжор Аляксандр Анісімаў. Цікавай абяцае быць і харэаграфія — абапіраючыся на адну з найстарэйшых пастановак М. Фокіна, якой амаль 100 гадоў, балетмайстар Юрый Траян унёс у фрагмент «Палавецкія скокі» мінімальныя трансфармацыі, каб зрабіць спектакль больш дынамічным і эмацыянальна насычаным. Пад іншым ракурсам паглядзелі ў Вялікім і на галоўных персанажаў: так, князь Ігар паўстане героем, але пры гэтым жывым чалавекам, не застрахаваным ад памылак і няўдач, а Яраслаўна — гэткім зборным вобразам славянскай жанчыны, здольнай пры неабходнасці ўратаваць і каханага мужчыну, і родную зямлю; дый наогул уся опера, абяцаюць стваральнікі, будзе «не вясёлай, але аптымістычнай гісторыяй». Між іншым, калі вам не ўдасца здабыць запаветныя білеты на прэм'ерныя паказы — не засмучайцеся, бо ўжо 21 верасня оперу ў 2 дзеяннях «Князь Ігар» пакажа ў эфіры сацыякультурны тэлеканал Беларусь 3.



Фота БелТА.

Гэта толькі першая з прэм'ер, якімі парадуе публіку тэатр у новым сезоне. 14 лістапада выпусціць балет «Ганна Карэніна» на музыку Пятра Чайкоўскага балетмайстар Вольга Косцель, 8 снежня прадставіць новую аўтарскую рэдакцыю знакамітага «Стварэння свету» Андрэя Пятрова мастацкі кіраўнік Вялікага тэатра Беларусі Валянцін Елізар'еў, далей у лісце чакання тэатралаў — аднаўленая опера «Набука» Джузэпэ Вердзі, дыпломная рэжысёрская работа Аксаны Волкавай — опера «Вілі» Джакама Пучыні і балет «Пер Гюнт» Эдварда Грыга ў пастаноўцы маладога харэографа Сяргея Мікеля.

Акрамя шэрагу міжнародных праектаў, тэатр захавае і ўласныя брэнды: Мінскі міжнародны Калядны конкурс вакалістаў (з 2020 года ён зменіць фармат і будзе праходзіць раз на два гады), «Навагодні баль у Вялікім», «Балетнае лета» і «Вечары Вялікага тэатра ў замку Радзівілаў». Таксама ў планах мноства праграм для дзяцей і моладзі, гастрольныя выступленні як на буйных замежных пляцоўках, так і па ўсёй Беларусі — у прыватнасці, пастаноўкі Вялікага тэатра змогуць убачыць гледачы Гродна, Гомеля, Магілёва, Наваполацка.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Май на ўвазе

# Пешаходам забароняць звяртаць увагу на гаджэты пры перасячэнні дарогі

**У новай рэдакцыі правіл дарожнага руху пешаходам забароняць звяртаць увагу на гаджэты, перасякаючы дарогу. Аб гэтым карэспандэнту БелТА расказаў старшы інспектар па асобых даручэннях УДАІ МУС Аляксандр ШАЎЧЭНКА.**

Грамадскае меркаванне праекта змяненняў ва ўказ аб мерах па павышэнні бяспекі дарожнага руху прайшло ў маі. Цяпер дакумент узгадняецца з дзяржорганамі. Неабходнасць у змяненні заканадаўства з'явілася ў тым ліку з-за развіцця тэхналогій: на дарогах стала больш транспарту, які аднесці да пэўнай катэгорыі ў рамках дзеючага заканадаўства цяжка. «Уводзіцца новы тэрмін «сродкі персанальнай мабільнасці». Гэта ўстройствы, якія маюць рухавік. Пры гэтым іх максімальна дапушчальная скорасць будзе складаць 25 км/гадз. Асобы, якія выкарыстоўваюць такія сродкі для перамяшчэння, будуць прыраўноўвацца да пешаходаў», — расказаў Аляксандр Шаўчэнка.

Калі ўстройства персанальнай мабільнасці, гэта значыць электрасамакат, гіраскутар або монакола, разганяецца больш як 25 км/гадз, не маючы заводскіх або праграмных абмежаванняў скорасці, з ім будзе забаронена ўдзельнічаць у дарожным руху. Катацца з такой хуткасцю дазволяць толькі на абмежаваных пляцоўках. «Перамяшчацца на такіх устройствах трэба будзе па веласіпедных дарожках. Пры іх адсутнасці — па тратуарах, абочынах, не ствараючы перашкод для руху іншым пешаходам», — растлумачыў прадстаўнік ДАІ.



Згодна з абноўленымі ПДР, будзе забаронена «пры выхадзе на праезную частку і руху па ёй рабіць дзеянні, якія пагражаюць бяспецы дарожнага руху». Як растлумачыў Аляксандр Шаўчэнка, гэта азначае, што, перасякаючы дарогу, нельга будзе ісці ў навушніках, у капюшоне, глядзець у тэлефон, паколькі гэта адцягвае ўвагу пешахода.

З'явіцца паняцце «зона з абмежаваннем максімальнай скорасці руху» і адпаведны знак. «Гэта зроблена, каб на кожным скрыжаванні не дубліраваць абмежаванне хуткасці, не ўстанаўліваць дадатковыя няроўнасці. Ёсць месцы, напрыклад, невялікія вулачкі ў цэнтры горада, з актыўным пешаходным рухам, машыны там таксама перамяшчаюцца. Уезды ў такія зоны будуць адзначаны спецыяльнымі знакамі. Гэта сусветная практыка, многія краіны выкарыстоўваюць такія зоны», — расказаў старшы інспектар. Скорасць у іх плануецца абмежаваць да 30 км/гадз.

Дадаткова ў ПДР абазначаць перыяды, калі ў машын павінна быць уключана блізкае святло фар, — з 25 мая да 5 чэрвеня і з 25 жніўня да 5 верасня. «У правілах і цяпер запісана, што ў час акцый «Увага — дзеці!» павінны быць уключаны фары. Мы канкрэтна вызначым гэтыя даты, каб усім было зразумела».

Плануецца таксама, што веласіпедыстам дазволяць не спешвацца на рэгулюемых пешаходных пераходах. Пры гэтым давядзецца запавольваць да скорасці людзей, якія перасякаюць дарогу. Гэта правіла будзе датычыцца і тых, хто выкарыстоўвае сродкі персанальнай мабільнасці. На пераходах жа без святлафора веласіпедыстам па-ранейшаму давядзецца ісці пешшу.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## Стывен, Дабрыня, Віяна, Ева Прыя — рэдкія імёны маленькіх мінчан

**Аднымі з самых рэдкіх імёнаў у першым паўгоддзі 2019 года сталі Дабрыня, Майкл, Хана, Віяна, Ева Прыя, паведаміла прэс-сакратар Міністэрства юстыцыі Беларусі Вольга Шыбко.**

У першым паўгоддзі ў сталіцы зарэгістравана 9709 нованароджаных. Перавагі ў выбары імёнаў у параўнанні з папярэднім годам асабліва не змяніліся. Хлопчыкаў бацькі часцей за ўсё называюць Максімамі, Арцёмамі і Мішамі, дзяўчынак — Анямі і Сонямі. Аднак не ўсе бацькі хочуць, каб іх малых звалі гэтак жа, як і многіх іншых, — так з'явіліся Алексы, Ірмы, Іланы, Стывены і Геральды. Бацькі могуць выбраць для дзіцяці любое імя, якое не супярэчыць нормам грамадскай маралі. Малому можа быць дадзена не больш двух уласных імёнаў. Імя, запісанае ў запісе акта аб нараджэнні першым, лічыцца асноўным.

**Паводле БелТА.**

## У Калмыкіі ў ДТЗ загінулі беларусы

**Renault з-за каровы ўляцеў у сустрэчную фуру, што каштавала жыццяў чатыром суайчыннікам.**

Аварыя адбылася вечарам у раёне пасёлка Адык Чарназямельскага раёна ў Рэспубліцы Калмыкія. Па інфармацыі Дзяржаўнай інспекцыі бяспекі дарожнага руху, каля 22 гадзін на 51-м кіламетры трасы Яшкуль — Камсамольскі 26-гадовы беларус на Renault Laguna наехаў на карову, пасля чаго аўтамабіль вылецеў на сустрэчную паласу і ўрэзаўся ў фуру Volvo.

У выніку ДТЗ кіроўца Renault і двое пасажыраў ад атрыманых траўмаў памерлі на месцы здарэння. Яшчэ адзін пасажыр легкавіка памёр у бальніцы. Усе загінулыя былі грамадзянамі Беларусі.

Па факце аварыі праводзіцца праверка. Супрацоўнікі паліцыі ўстанавілі ўладальніка каровы.

## Смяротныя міліметры

**Амаль 100 боепрыпасаў часоў вайны было знойдзена ў Віцебскім раёне, паведамілі ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Віцебскага аблвыканкама.**

Удзень у лясным масіве паблізу вёскі Лучынаўка былі выяўлены: два артылерыйскія снарады калібру 76 міліметраў, 73 артылерыйскія снарады калібру 45 міліметраў, дзве гранаты Ф-1, 12 гранат РТД-33, адна мінамётная міна калібру 82 міліметры.

Акрамя таго, там жа знайшлі 60 артылерыйскіх узрывальнікаў і дзве гільзы з капсульнай утулкай — усё часоў Вялікай Айчыннай вайны. Боепрыпасы былі вывезены ў бяспечнае месца і знішчаны сапёрна-піратэхнічнай групай в/ч 5524 унутраных войскаў МУС.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Сугучча

# Прывітанне Узбекістану ад краіны дабрыні

**Працягам у развіцці беларуска-узбекскіх літаратурных сувязяў на сучасным этапе стала выданне ў Ташкенце калектыўнага зборніка твораў паэтаў Беларусі.**

«Добры дзень, краіна дабрыні!» — так называецца кніга вершаў, у якой на ўзбекскай мове гучаць творы народнага паэта Беларусі Якуба Коласа, Навума Гальпяровіча, Міколы Мятліцкага, Віктара Шніпа, Леаніда Дранько-Майсюка, Таццяны Сівец, Юліі Алейчанкі. Перакладчыкам усіх падборак выступіў Мінжахіддзін Мірзо. Вядомы ва Узбекістане паэт і перакладчык — яшчэ і першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Узбекістана.

Наклад кнігі — 1000 экзэмпляраў. Асноўнаму зместу паэтычнага зборніка папярэднічае грунтоўная прадмова Мінжахіддзіна Мірзо, прысвечаная ўвогуле развіццю беларуска-ўзбекскіх гуманітарных, культурных адносін. У ёй згадваюцца і імёны тых беларускіх літаратараў, якія і самі першымі адкрывалі Узбекістан, і з творамі якіх у перакладзе на родную мову ўзбекскі чытач пазнаёміўся найперш, — Мікола Хведаровіч, Іларыён Барашка, Пятро Глебка, Янка Купала. Кніга «Добры дзень, краіна дабрыні!» выйшла ў свет у серыі «Беларуская паэзія». Значыць, і іншых сучасных паэтаў нашай Беларусі адкрые для сябе ў найбліжэйшай будучыні ўзбекскі чытач.

**Сяргей ШЫЧКО.**

# ПРЫГОДЫ НА «ЗЯЛЁНЫМ» ПЛЯЖЫ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## Нататнік са «зладзеямі» і голы мужчына

Міліцыянеры кажуць, што ўздоўж берага ў абсталяваных альтанках звычайна адпачываюць людзі сямейныя, часта з дзецьмі, таму тут больш спакойна і вытрымана. А вось на востраве хаваюцца часцей падлеткі ад 15 да 18, якія прагнуць пакаштаваць дарослых напояў. Аднак гэтым разам атрымалася наадварот.

Супрацоўнікі міліцыі **сяржант Мікалай КІБІС** і **старшы сяржант Іван БАРАНАЎ** патрулююць па восем гадзін на дзень. За гэты час, кажуць, можна і 20, і 30 кіламетраў нахадзіць. Да майго прыходу служба іх доўжылася ўжо гадзіны тры і пакуль нічога падазронага не здарылася.

У гэтым месцы адпачынку ў праваахоўнікаў два маршруты. Ад паркоўкі да вострава — крыху менш за кіламетр і па самім востраве — каля 750 метраў. Найперш мы выправіліся на абход вострава. На беразе месцамі сядзелі парачкі, нічога супрацьзаконнага. Мінаючы чарговы паварот, пачулі ад жанчыны ў гадах, якая прымала сонечныя ванны:

— Ён мне адпачываць перашкаджае. Голы мужчына побач, на думкі розныя наводзіць...

— Хто, дзе? — пытаюцца мае праваднікі.

Непадалёк за кустом на жывацее ляжыць голы мужчына.

— Я проста сохну пасля купання, — тлумачыць ён.

— А што гэта да цябе, Юра, маюць? — уступае яшчэ адна жанчына, якая шпацыруе па сцежцы.

Аказалася, усе яны адно аднаго ведаюць, і першая жанчына проста пажартавала. Тым не менш у «нудыста» правяраюць дакументы, запісваюць адрас і раяць апрануцца. Міліцыянеры ставяцца да гэтага сур'ёзна, бо за намеранае раздзяванне перад іншымі прадугледжана крымінальная адказнасць. Аднаго такога мужчыну сёлета, дарэчы, затрымалі, а вось на дзвюх топлес ні разу наракання не было, жартуюць праваахоўнікі.

Амаль кожны, да каго звяртаюцца патрульныя за дробнае парушэнне і хто пагаджаецца адразу выправіць становішча, трапляе ў нататнік міліцыянераў. Гэты службовы блакнот ляжыць у аддзеле і, кажуць, дапамагае, калі раптам парушальнік ізноў зробіць нешта падобнае ці што горшае. Тады па адрасе адразу бачна, што з ім ужо праводзілі прафілактычную размову.



## «Гарачыя» напоі пад вогнішча

Затрымаць могуць не толькі за распіццё, але і за хуліганства, да якога прылічваецца і выкарыстанне кусцікаў у якасці прыбіральні. Або калі іншыя скардзяцца, што да іх кампаніі нехта чапляецца, не дае прайсці ці абражае.

Паабапал сцежкі, па якой мы абыходзім востраў, месцамі заўважаю кастрышчы. Удакладняю, ці можна тут паліць вогнішча. Гэта сапраўды забаронена, і за такі занятак таксама затрымаюць.

— Уздоўж берага ўсталяваны мангалы, так што цяжкасцяў няма ніякіх, каб нешта згатаваць, — каментуе Іван Баранаў.

Аднак менавіта пад агеньчык, здараецца, адпачываюць тыя самыя непаўналетнія, якія сыходзяць далей ад чужых вачэй. Каштуюць яны і піва, і гарэлку. Калі з такімі кампаніямі сутыкаюцца, пытаюцца іх узрост, правяраюць дакументы, тлумачаць, што яны затрыманы за распіццё спіртных напояў і антыграмадзянскія паводзіны, і дастаўляюць у найбліжэйшы пункт міліцыі для складання пратакола, выклікаюць бацькоў. Падлеткі праходзяць алкатэст.

Астатняе — справа супрацоўнікаў камісіі па справах непаўналетніх (КСН).

— Як можна затрымаць кампанію падлеткаў удвух? А калі яны па кустах уцякаць пачнуць? — пытаюся.

— Ні за кім яшчэ не бегалі. У нас жа аўдыё- і відэазапіс вядзецца. Яго потым і прыкладаюць пры разглядзе справы, — кажа старшы сяржант.

Дастаткова аднойчы папасціся за выпіўкай — і ты ўжо пад увагай не толькі ў супрацоўнікаў КСН, але і ў школы. Да паводзін непаўналетніх стаўленне жорсткае, бо напой самі яны не толькі ўжываць не маюць права, але і набыць яго не могуць. Міліцыянеры кажуць, што ні разу яшчэ не было, каб нехта проста за кампанію сядзеў у такіх выпадках, ва ўсіх сляды алкаголю знаходзяцца.

— А калі ў кампаніі непаўналетніх трапляецца дарослы, які набыў «гарачы» напой, то да яго ўжо прымяняецца артыкул за ўцягванне непаўналетніх у антыграмадскія паводзіны, — удакладняе Мікалай Кібіс. — За гэта яму пагражае штраф ад дзесяці базавых велічынь.

## Спакой або медыцынская дапамога

За размовамі абыходзім востраў і ідзём уздоўж берага возера. Усе альтанкі занятыя, паўсюль кампаніі, дастаткова шматлюдныя. Заўважаю каля прыхаванага на ўскрайку лесу абсталяванага мангала шчодра накрыты стол і кампанію з чатырох мужчын. Ад іх пахне спіртным, аднак навідавоку напояў няма. Міліцыянеры папярэджваюць пра забарону алкаголю і рушаць далей, аднак пазней абавязкова вернуцца сюды, каб праверыць. Адпачывальнікі часам кажуць, што шашлык паліваюць півам для водару, а каб даказваць, што чалавек яго яшчэ і піў, міліцыянерам трэба мець падставу, напрыклад, заўважыць у парушальніка прыкметы ап'янення.

Дзяжурствы выдаюцца розныя. Бывае, нічога не здарыцца за час патрулявання, аднак калі-нікалі хуткую дапамогу даводзіцца выклікаць, асабліва п'яным.

— Чалавеку можа быць дрэнна, магчыма, у яго алкагольная інтаксікацыя, тады лепш даверыць справу медыкам, а не везці парушальніка ў патрульнай машыне. Мы дзейнічаем паводле свайго меркавання, у залежнасці ад абставін, — кажа Мікалай Кібіс. — Не абавязкова ж адразу затрымліваць і складаць пратакол. Можна папрасіць кампаніі не выпіваць, асабліва калі яны толькі пачалі, або заклікаць іх проста з'ехаць, каб не было наступстваў. Звычайна ўдаецца дамаўляцца, калі людзі паводзяць сябе прыстойна.

З гэтымі словамі ён накіроўваецца да альтанкі, абвешанай паветранымі шарыкамі. Па ўсім відаць, тут студэнцкі дзень нараджэння. На стале бутэлькі з віном. Адпачывальнікі разумеюць прэтэнзіі, засмучаюцца, але ж напоі прыбіраюць. Тое ж робіць і другая кампанія, якая саграваецца півам каля мангала пасля купання. Запісваюцца імёны, адрасы, усе хаваюць спіртное і працягваюць адпачынак.

А вось у наступнай групе, якая якраз дружна сабралася выпіць, натыкаемся на непаразуменне: «Дык усе ж выпіваюць, мы што, крайнія сталі?» Спрабуюць і адгаворвацца, і нават бутэлькі хаваць не спяшаюцца:

— Мы ж не ведалі, што тут нельга, ніякіх знакаў не бачылі, на таксі пад'ехалі...

Мужчыны пачынаюць званіць некаму па тэлефоне, скардзяцца, што да іх «дачапіліся»... Сітуацыя праз гэта толькі пагаршаецца, і абяцанні «мы зараз пойдзем адсюль» на міліцыянераў ужо не дзейнічаюць.

— Такія агрэсіўныя дзеянні не даюць ніякіх гарантый, што яны далей будуць паводзіць сябе прыстойна, — тлумачыць сяржант.

Пасля 15 хвілін перамоў падыходзяць яшчэ два праваахоўнікі, і траіх затрыманых вядуць да аўтобуса, на якім прывозяць ва ўчастак. Тут на іх ужо складуць пратаколы, і парушальнікі заплацяць штраф.

Як паказаў алкатэст, адзін з мужчын увогуле не піў і паехаў з сябрамі за кампанію. А трапілі яны ўсе ў такое становішча праз упартасць, сварку ды пагрозы аднаго з іх. Думаецца, самі сябры з ім таксама пасля правядуць размову. Праваахоўнікі накіроўваюцца далей несці службу, а карэспандэнт — пісаць пра свае прыгоды...

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**



## У пятым Мінскім паўмарафоне прыме ўдзел каля 40 тысяч чалавек

**Адна з грандыёзных падзей нашай сталіцы пройдзе ў гэту нядзелю**

**Пяты Мінскі паўмарафон стартуе заўтра ў 9.00. Больш за 40 тысяч чалавек возьме ўдзел у гэтым свяце спорту і здаровага ладу жыцця. Заўтра на ім будзе працаваць 1 тысяча валанцёраў.**

Вядомая беларуская бягуння на доўгія дыстанцыі Вольга Мазуронак сёлета прапусціць паўмарафон, таму што праводзіць падрыхтоўку да чэмпіянату свету ў Досе. Мазуронак была пераможцам Мінскага паўмарафона ў 2015 і 2016 гадах.

Мінскі паўмарафон традыцыйна з'яўляецца адной з самых маштабных спартыўных падзей у Беларусі. Летась у ім брала ўдзел больш за 35 тысяч аматараў здаровага ладу жыцця, сёлета гэтая лічба яшчэ вырасце. Старт паўмарафона пройдзе ўжо пяты раз.




## Карысна ведаць

# Усе кіроўцы электробусаў ў госці да нас

**У першыя тры дні кастрычніка ў Мінску пройдзе Беларускі транспартны тыдзень. Гэты штогадовы міжнародны транспартна-лагістычны форум уключае ў сябе міждзяржаўную спецыялізаваную выстаўку «Транспарт і лагістыка», а таксама шырокую дзелавую праграму.**



Фота БелТА.

У транспартным тыдні штогод прымаюць удзел транспартна-лагістычныя і страхавыя кампаніі, вытворцы і дылеры аўтатэхнікі, адміністрацыі марскіх партоў і кіравання чыгунак з краін СНД, блізкага і далёкага замежжа. Мэтай БТТ-2019 з'яўляецца развіццё рынку транспартных паслуг, прыцягненне інвестыцый у эканоміку краіны, удасканаленне бяспекі транспартнай дзейнасці, умацаванне іміджу і павышэнне пазіцый нашай краіны ў міжнародных рэйтынгах.

У ходзе канферэнцыі «Развіццё інфраструктуры электрычных транспартных сродкаў і інтэлектуальных транспартных тэхналогій» будуць вывучаны сусветныя тэндэнцыі развіцця электрычных транспартных сродкаў. Там жа разгледзяць становішча рынку электрамабіляў у нашай краіне, эканамічныя механізмы для стымулявання выкарыстання электрамабіляў, фарміраванне сеткі зарадных станцый і сэрвісны інфраструктуры.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Тэхнічная рэвалюцыя беларускай пошты

**У канцы жніўня мы расказвалі пра тое, як беларуская пошта працавала да Вялікай Айчыннай вайны. І калі раней тэхналагічныя змены закраналі арганізацыю дастаўкі паведамленняў і адпраўленняў у цэлым — з'явіліся паштовыя вагоны, самалёты і нават кальцавая пошта, — то ўмовы працы супрацоўнікаў аддзяленняў паштовых сувязяў змяняліся, на жаль, не так хутка. Яшчэ семдзесят гадоў таму аўтаматызацыя працоўнай дзейнасці здавалася чымсьці фантастычным. Як і раней, стосы лістоў апрацоўваліся пераважна ўручную. А іх тады было значна больш, чым у наш час. Тэлефонныя правады дацягваліся далёка не ў кожную кватэру, як цяпер. Пра мабільную сувязь і тым больш электронную пошту і ўвогуле ніхто нават не чуў. А па тэлеграфе доўгія пасланні не адправіш, бо тарыфікацыя ідзе за кожнае слова. Вось так ліставанне і заставалася фактычна адзіным сродкам сувязі.**

Якія апараты дазвалялі палегчыць працу супрацоўнікам паштовых аддзяленняў?

«Канешне, марыць пра аўтаматызацыю ў першыя пасляваенныя гады было занадта, — згадвае **супрацоўніца гісторыка-інфармацыйнага цэнтра РУП «Белпошта» Таццяна ГУЗЯНКОВА.** — Якія там машыны — канцылярскіх прылад і мэблі амаль не настаўлялася з «цэнтра»! Прадпрыемствы на тэрыторыі, якія вызвалілі з-пад нямецкай акупацыі, былі ў жудасным стане, а ўсё астатняе працавала ў першую чаргу на патрэбы арміі і фронту. Таму кожны супрацоўнік нёс з дому тое, што ацалела за тры гады вайны: хтосьці чарнільныя ручкі, хтосьці — пару крэслаў, хтосьці — паперу... Вось так фактычна на энтузіязме і працавалі першы час.

...Нязменным атрыбутам аддзяленняў паштовай сувязі, які «дажыў» да дзевяностых, былі лічыльнікі. Касцякі там ганялі да таго часу, пакуль не пачалася масавая камп'ютарызацыя і не з'явіўся шырокі асартымент калькулятараў. Я калісьці ўзначальвала 114-е аддзяленне сувязі, якое знаходзіцца цяпер насупраць Нацыянальнай бібліятэкі. У мяне было 12 даставачных участкаў. У раёне жыло даволі шмат пенсіянераў. І вось, калі наступаў час выдачы пенсіі, усе раскладвалі ведамасці і лічылі, колькі грошай трэба даць паштальёну для дастаўкі. І крый божа, было памыліцца хоць на адну капеечку!

У музейнай экспазіцыі захаваліся вельмі нязвыклыя для сучаснага вока тэлефонныя апараты без наборнага дыска і панэлі з кнопкамі. Гэта рарытэт з тых часоў, калі тэлефонныя станцыі не былі аўтаматычныя, а ўся сувязь устанаўлівалася праз выклік «барышні», якая злучала кантакты на станцыі ўручную».





Касавая электрамеханічная машына «Анега», выпушчаная ў 1970 годзе.

## Электрамеханічныя папярэднікі камп'ютараў

Сапраўдным прарывам сталі маркіравальныя машыны. Яны з'явіліся ў самым пачатку 1960-х гадоў, калі перапіску ў вялікіх аб'ёмах пачалі весці шматлікія прадпрыемствы і арганізацыі. Ды і тое вымушана — аб'ём лістоў рос настолькі хутка, што клеіць маркі і ставіць штэмпелі ўручную стала проста фізічна немагчыма. І штат таксама бясконца раздуваць нельга. Уявіце сабе, што перапіску вядзе, напрыклад, завод стратэгічнага прызначэння, на якім працуе не адна тысяча людзей. Лісты мераліся мяшкамі.

Працавала маркіравальная машына вельмі проста. Набіраўся кошт перасылкі, які складаў чатыры капейкі, — і пайшлі канверты пракатвацца адзін за другім.

Былі таксама спробы сысці ад класічных лічыльнікаў. Спярша іх паспрабавалі замяніць на арыфмометры «Фелікс». Яны дазвалялі працаваць з лічбамі да дзевяці знакаў. Але ўсё роўна на лічыльніках пры пэўным досведзе аперацыі атрымлівалася рабіць хутчэй. Таму «Феліксы» на доўгі час на пошце масава не затрымаліся. На змену ім прыйшла лічыльная машына «Аскота». Знешне яна нагадвае нейкі дзіўны гібрыд механічнага калькулятара з тэлефонам. У прынцыпе, такім жа быў і яе функцыянал. Разам з тым новыя лічыльныя машыны дазвалялі друкаваць вынікі падлікаў на паперы, што было на той час істотным прагрэсам.



Лічыльнікі і арыфмометры «Фелікс».

— А вось усе квітанцыі выпісваліся толькі ўручную, — працягвае Таццяна Гузянкова. — Уявіце, наколькі гэта зацягвала час, патрэбны на выкананне аперацыі. Вось існуюць жа жарты пра почырк урачоў, маўляў, яго разабраць вельмі складана. У паштовых супрацоўнікаў за савецкім часам было не нашмат лепш. Асабліва гэта датычылася, напрыклад, адрознення сямёрак і адзінак. І таму ў 70-я гады з'явілася «прабабуля» ўсіх цяперашніх невялікіх касавых апаратаў — механічная машына «Анега-3-1М». Падобныя на яе прылады яшчэ пару дзесяцігоддзяў таму стаялі ў старых крамах. Разам з ёй з'явілася куды больш складаная электрамеханічная мадэль з дзясяткамі кнопак. Яны былі прызначаны для прыёму паштовых адпраўленняў. Тут знаходзіцца некалькі ключоў, якія дазваляюць прымаць тэлеграму і падпіску. А вось прыняць пасылку было немагчыма — цыкл аперацый быў недастатковы.

Увогуле, нагрувашчаны па мерках нашага часу знешні выгляд электрамеханічных агрэгатаў 40—50-гадовай даўніны — панэлі з некалькімі шэрагамі, чый лік вымяраўся дзясяткамі, — тлумачыцца вельмі проста. Па-першае, тэрыторыя СССР дзялілася на паясы. Для кожнага з паясоў устанаўліваўся свой кошт паштовага збору. Па-другое, трэба было набіраць уручную кошт пасылкі і заяўленую вартасць. Асобна — калі патрабавалася дадатковая паслуга, напрыклад паслаць пасылку з тэлеграфным паведамленнем. Трэба было пастаянна аперыраваць пераключальнікамі, часам — і на лацінскі алфавіт. Але машына дазваляла адразу ж на месцы рабіць для супрацоўнікаў пошты і копію дакумента, які аддаваўся на рукі кліенту. Пагадзіцеся, ужо гэта прыкметна скарачала час работы. Аднак з укараненнем камп'ютараў усе гэтыя агрэгаты адправіліся ў музей...

## Дарогу вынаходнікам!

— Рацыяналізатарскі рух, шырока распаўсюджаны ў савецкі час, закрануў і пошту, — працягвае Таццяна Гузянкова. — Напрыклад, узяць хоць славуты гадзіннік на Галоўпаштамце, што паказвае, якая зараз гадзіна ў буйных гарадах свету. Калісьці ён з пачаткам кожнай гадзіны граў мелодыю. І гэта было вынаходніцтва нашай вытворчай лабараторыі. За гэта яе ўзнагародзілі.

А яшчэ паштавікі прыдумалі так званы «заспакаяльнік вадкасці». Выкарыстоўваўся ён у паштовых вагонах, якія ездзілі па многіх чыгуначных лініях. Хоць карэспандэнцыя мусіла дастаўляцца ў як мага больш сціслыя тэрміны, вагон нярэдка быў у дарозе і суткі, і двое. Падчас паездкі хочацца папіць той жа гарбаты або кавы. А як гэта зрабіць, калі вагон гойдаецца і вадкасць можа праліцца? Сітуацыю выправіў невялікі металічны выраб, чымсьці аддалена падобны на вінт карабля з лопасцямі. Здавалася б, гэта драбяза, але колькі карысці прынесла!



Тэлеграфны апарат СТА-67.

## А сургуч сышоў у гісторыю

Ёсць у музеі і электрасургучніца. Калісьці пры яе дапамозе на паштовыя адпраўленні наносілася рэльефная пячатка. Яна пацвярджала тое, што ніякая трэцяя асоба па дарозе не скрала таварнае ўкладанне.

Праўда, ад сургучу нашы паштальёны ўсё ж адмовіліся, хоць гэта быў адзін з сімвалаў пошты яшчэ са старадаўніх часоў — сургучныя пячаткі выкарыстоўваліся яшчэ з XIX стагоддзя! Прычыны гэтага былі простыя. Па-першае, з развіццём тэхналогій выкарыстоўваць сургуч стала неэфектыўна і нават небяспечна. Пры яго награванні выдзяляюцца не вельмі карысныя выпарэнні, удыханне якіх даволі шкоднае для арганізма. Каб мінімізаваць іх уздзеянне, трэба абсталёўваць асобную сістэму вентыляцыі на рабочым месцы, каб адвесці пах. Акрамя таго, можна было атрымаць і вытворчую траўму, калі нават трохі расплаўленага сургучу капне на руку. Ну і акрамя таго, патрэбны былі выдаткі на ўтылізацыю ўжо выкарыстаных пячаткаў.

— Сургуч таксама часта выкарыстоўваўся пры ўпакоўцы пасылак у драўляныя скрыні, — кажа Таццяна Гузянкова. — Калі ён выкрышваўся,то ў прысутнасці атрымальніка пасылка ўскрывалася і рабіўся акт вопісу, каб упэўніцца, што ўсё дайшло ў цэласці.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.**

Конкурс

# Абраны найлепшы паштальён



**З 11 па 13 верасня ў Мінскім раёне праходзіў XXIII Рэспубліканскі конкурс прафесійнага майстэрства работнікаў аб'ектаў паштовай сувязі. 42 работніцы з усіх абласцей і Мінска спаборнічалі за званне найлепшай па ўзроўні краіны.**

На фінальны этап яны прыехалі з ужо выкананым хатнім заданнем. Яно рыхтавалася на тэму «Паслуга года» і было прысвечана самым перадавым і запатрабаваным у насельніцтва прапановам пошты. Удзельніцы таксама прэзентавалі свае рэгіёны з дапамогай малых архітэктурных формаў. Але, акрамя творчасці, трэба было прадэманстраваць свае веды і ўменні як на тэарэтычным іспыце, так і на практычным занятку.

**Галіна Бараноўская працуе паштальёнам 5-га разраду ў аддзяленні № 7 у Мазыры.** Яна сёлета стала найлепшай у краіне па сваёй прафесіі.

— Думаю, што мне вельмі пашанцавала. Перад рэспубліканскім этапам у нас жа яшчэ быў абласны, — згадвае жанчына. — Мы там паказвалі свае ўменні: абслугоўванне па сваім участку, выдачу пенсій, паштовых адпраўленняў... Здавалася б, на іспыце я раблю тое ж самае, што і кожны рабочы дзень, але вось такая прыемная нечаканасць здарылася. Працую я на пошце ўжо сем з палавай гадоў. Прыйшла сюды, таму што падабаецца быць у кантакце з людзьмі. Яны на маім участку вельмі добразычлівыя. Праўда, жылога сектара не так шмат — у маёй зоне абслугоўвання жыве каля 700 чалавек. Пажылыя людзі вельмі чакаюць лістоў ад сваіх сваякоў, якія жывуць у іншых краінах, толькі іх прыходзіць няшмат. Але затое вельмі актыўна перапіску вядуць арганізацыі.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

## Государственное предприятие «МГЦН» извещает о проведении 18 октября 2019 г. аукционных торгов по продаже права заключения договоров аренды имущества, в рамках 265-го открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной и иной собственности

| № предмета аукциона | Местонахождение имущества | Площадь (кв. м) | Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы или размер арендной платы | Начальная цена права заключения договора аренды объекта (руб.) | Целевое использование имущества | Сумма задатка (руб.) | Характеристика имущества и иные сведения |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Арендодатель – УП «Жилье»**, тел. 8 (0177) 76-85-32 | | | | | | | |
| 55 | Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 8-е Марта, 25-90 | 32,2 | 1,0 | 136,05 | Под офис, склад, организацию торговли непродовольственной группой товаров (кроме магазинов ритуальных услуг), предоставление услуг (кроме похоронных бюро) | 13,60 | Помещение расположено в подвале жилого дома. Стены – кирпичные; вентиляция – принудительная; водопровод и отопление – центральные; электроснабжение – имеется возможность подключения к электроснабжению, электропроводка скрытая; полы – плитка. **Срок аренды – 3 года** (23*) |
Аднак палітычнае дамінаванне ўсё ж перайшло ад Сальвіні, а яго партыя выпала з кола прэтэндэнтаў на далейшае кіраванне краінай. Ключавую ролю пры гэтым адыгралі дзеянні прэм'ер-міністра Кантэ. Ён абвінаваціў лідара «Лігі» ў замаху на святы месяц адпачынкаў — жнівень, у занадта вялікай актыўнасці ў сацсетках, у крытыцы калег па кабінеце. Галоўны папрок быў у тым, што Сальвіні вырашыў скарыстацца момантам: як толькі яго рэйтынг дасягнуў 40 працэнтаў, абвясціў пра распад кааліцыі і запатрабаваў датэрміновых выбараў.

Вось як на гэта абвінавачванне ў аўтарытарызме адрэагаваў сам Сальвіні: «Нас называюць фашыстамі, дыктатарамі. Але мы адзіныя, хто заклікае ісці на выбарчыя ўчасткі. За адзін год на пасадзе віцэ-прэм'ера, нягледзячы на тое што мяне называюць небяспечным дэспатам, я зрабіў Італію больш бяспечнай. Я лічу, што адзіны дэмакратычны шлях — гэта меркаванне італьянскага народа»: заявіў лідар «Лігі», тагачасны кіраўнік МУС Італіі.

Між тым выступленне Кантэ (які пасля падаў у адстаўку) сустрэла жывы водгук, умацаваўшы яго асабісты рэйтынг. Апытанне грамадскай думкі ўпершыню паказала зніжэнне электаральнай падтрымкі Сальвіні. У распачатых пасля кансультацыях прэзідэнта з лідарамі парламенцкіх фракцый «пяцізоркавыя» вылучылі кандыдатуру Кантэ на пасаду прэм'ер-міністра. Правёўшы два раўнды перагавораў, Матарэла даручыў яму фарміраванне новага кабінета з прадстаўнікоў «Руху» і Дэмпартыі — дзвюх вядучых па колькасці дэпутатаў палітычных сіл дзеючага парламента, учарашніх непрымірымых праціўнікаў.

«Мы любім Італію, і мы лічым небескарысным паспрабаваць», — заявіў кіраўнік ДП Нікола Дзінгарэці падчас сустрэчы з кіраўніком «Пяці зорак» Луіджы дзі Маё. Аднак, як заўважыла на сайце gazeta.ru старшы навуковы супрацоўнік Інстытута Еўропы РАН Алена Аляксеенкава, імкненне ідэалагічных праціўнікаў працаваць разам можа абярнуцца супраць іх. «Гатоўнасць партый паступіцца ідэалагічнымі прынцыпамі і жаданне пазбегнуць галасавання не дадаюць гэтай кааліцыі легітымнасці і даверу ў вачах грамадзян», — мяркуе эксперт.

### Хлопец па суседстве

Па выніках апытання інстытута Noto Sondaggi, рух Сальвіні ў Італіі падтрымліваюць 38 працэнтаў выбаршчыкаў, на другім месцы размясцілася Дэмакратычная партыя (23 %), і толькі затым «Рух пяці зорак» (16,5 %). Як паведаміла gazeta.ru, італьянскі палітолаг Марк Бернардзіні лічыць, што сённяшні расклад сіл у парламенце краіны не адпавядае чаканням італьянцаў. «Калі народ пайшоў направа, значыць, урад павінен быць правы. Аб'ектыўна цяперашні парламент больш не адпавядае настроям электарату», — заўважае Бернардзіні. На думку эксперта, «не факт, што ўрад дажыве да канца склікання — 2022 года».

Як адзначыла Алена Аляксеенкава, пагадненню паміж партыямі дапамагла папулярнасць прэм'ера і прэзідэнта: Джузэпе Кантэ валодае высокім рэйтынгам у 52 працэнты, Серджа Матарэла — 57. Праграмы партый таксама моцна адрозніваюцца. «Дзі Маё падкрэслівае пераемнасць курсу, а Дэмпартыя — паварот палітыкі як у сферы эканомікі, так і ў сферы міграцыі. Відавочна, што Дэмпартыя, якая разлічвае атрымаць пасаду ў ЕС, будзе настойваць на згортванні міграцыйнай палітыкі Сальвіні і прыпыненні шэрагу эканамічных рэформаў», — адзначыла супрацоўнік Інстытута Еўропы. Прэса канстатуе паспяховае ўзаемадзеянне «старога-новага» прэм'ера з кіраўніцтвам ЕС і сімпатыю да яго сусветных лідараў. У прыватнасці, Дональд Трамп назваў яго «вельмі таленавітым чалавекам». Аднак Кантэ, які прыняў свой мандат «умоўна», пры пэўных абставінах можа яго вярнуць, як гэта адбылося амаль годам раней з-за рознагалоссяў з прэзідэнтам па кандыдатуры міністра эканомікі, лічыць Агнеса Авілава.




У экспертаў вельмі песімістычныя прагнозы наконт эканамічнай будучыні Апенін. «Мы ўсе ведаем, што ў Італіі будзе чарговы крызіс, пытанне толькі ў тым, калі ён здарыцца», — адзначала агенцтва Bloomberg. «Мы рухаемся па сцэнарыі патэнцыйнага дэфолту», — заўважыў заснавальнік LC Macro Advisors Ларэнца Кадоньа. Італія можа вельмі хутка трапіць у вельмі няпростую сітуацыю, падобную да тых, у якія ў ходзе нядаўняй вострай фазы пазыковага крызісу ў еўразоне аказваліся Грэцыя, Ірландыя, Партугалія, Кіпр: аб'яўляць дэфолт ці прасіць ЕС і МВФ аб фінансавай дапамозе, пагаджаючыся на іх патрабаванні рэформаў і жорсткай эканоміі пад пільным кантролем крэдытораў.

Правы лагер па-ранейшаму патрабуе датэрміновых выбараў і заклікае сваіх прыхільнікаў да масавых публічных пратэстаў. Не варта забываць і пра тое, што Матэа Сальвіні застаецца надзвычай папулярным італьянскім палітыкам, аўтарытэту і харызмы яму не пазычаць. «Сальвіні — «хлопец па суседстве», — заўважыў яго біёграф Матэа Пучыарэлі. — Ён тыповы сын італьянскіх бацькоў, адкрыты, просты, з ім можна пагаварыць пра што заўгодна». Так што не выключана, што ў амбіцыйнага лідара «Лігі» яшчэ з'явяцца шанцы сфарміраваць уласны ўрад. Прынамсі, для гэтага ёсць усе перадумовы.

**Захар БУРАК.**

Руплівым гаспадарам

# Хто напаў на Проста Марыю?

## ВЫБІРАЕМ САРТЫ ГРУШ



**Духмяная, Спакуса, Купала, Жнівеньская раса... Адна за другой надразаюцца сакавітыя грушкі, і мы смакуем, прыцэньваемся, выбіраем. У Інстытуце пладаводства НАН Беларусі праходзіць семінар, прысвечаны сартам летняга выспявання.**

Падчас такіх заняткаў любы ахвотны (хоць спрактыкаваны садавод, хоць пачатковец) можа даведацца, як розняцца грушы колерам, формай, памерам, смакам. Вучоба праходзіць у садзе, дзе можна паглядзець, як растуць дрэўцы, як нагружаны ўраджаем, ці пашкоджваюцца хваробамі. Нідзе вы не атрымаеце столькі інфармацыі! Усё ж вучоныя ў сваіх садах назіраюць за дрэўцамі працяглы перыяд. Глядзяць, як тыя пачуваюць сябе ў розных кліматычных умовах, адсочваюць, выбіраюць для селекцыі расліны, здольныя прыстасоўвацца пад наша надвор'е і найбольш устойлівыя да хвароб. Спрабуюць стварыць новыя сарты, якія спалучаюць у сабе шэраг карысных уласцівасцяў: жывучасць (маладзенькія дрэўцы нават спецыяльна заражаюць рознымі хваробамі), буйнаплоднасць, прыдатнасць для захоўвання, і пры гэтым яны павінны быць смачныя. Але нават на адным і тым жа дрэўцы ў адзін год могуць вырасці кіслыя грушкі, а ў другі, калі будзе многа сонца, яно парадуе сакавітымі салодкімі пладамі. У нейкі сезон яно здзівіць вялікім ураджаем, а ў наступны можа падмерзнуць і нават загінуць.

У Інстытуце пладаводства сабрана багатая калекцыя сартоў з усяго свету, таму тут могуць падказаць, якія «замежнікі» нядрэнна сябе пачуваюць у беларускіх садах. Ведаюць тут і радаслоўную раслін, падкажуць, у якіх сартоў аднолькавыя «бацькі», падобныя якасці і смак.

— Гэта Чыжоўская — раянаваны сорт. Больш устойлівая да хвароб (значыць, менш трэба рабіць апрацовак). Акуратненькія, таварныя плады. Сярод мінусаў — з кіслінкай і камяністая. Хоць у добры год выдае плады, якія людзям падабаюцца па смаку, — знаёміць з чарговай грушкай **вядучы навуковы супрацоўнік аддзела селекцыі пладовых культур Вольга ЯКІМОВІЧ.**

На смак пладоў можа ўплываць не толькі надвор'е. Шмат залежыць ад глебы і жыўлення, якое атрымлівае дрэўца. Садаводы, што прыехалі на семінар, дзеляцца сваімі назіраннямі. Прадказаць, якому менавіта сорту будзе добра на вашым участку, вельмі цяжка. Так, у адных гаспадароў Проста Марыя дае добры ўраджай і плады захоўваюцца працяглы час, а ў другіх дрэўца хварэе, грушы рана асыпаюцца, не ляжаць. Часам на адным участку пэўны сорт можа выдатна сябе пачуваць, а ў суседзяў — не прыжывецца. І знайсці тлумачэнне, чаму пэўнаму сорту «спадабалася» ці не «спадабалася» расці ў нейкім месцы, часам не так проста — гэта залежыць і ад размяшчэння саду, і ад грунтовых вод, і нават ад таго, што вырошчваецца непадалёк на калгасным полі ці на сумежных участках. Можа, у вас за плотам сцелецца суседскі ядловец — а менавіта з такой «дэкаратыўкі» ў грушавыя сады часта перабіраецца ржа, змагацца з якой вельмі цяжка.



Магчыма, і сам гэты год з вясенняй і чэрвеньскай засухамі і познімі майскімі замаразкамі падкіне садаводам Беларусі розных неспадзяванак. Адыходзіць ад стрэсу расліны могуць некалькі гадоў. І беды, хваробы, з якімі вы сутыкняцеся будучым летам, могуць быць якраз наступствамі папярэдняга праблемнага сезона.

Часам і вучоным расліны задаюць многа загадак. Вольга Аляксандраўна спачатку заводзіць нас на адзін участак. Паказвае, якія чыстыя лісточкі і плады на дрэўцах. А пасля мы прабіраемся праз рад высачэзных ліп — і адразу трапляем у суседні сад, і тут зусім іншы малюнак — і пладовая гніль, і лісты ўсе пабітыя на дрэўцах іржавымі ды чорнымі плямамі. Апрацоўваліся сады аднолькава, але чаму адзін ідэальна чысты, а ў другім парша буяла як ніколі і праявілася, калі плады былі зусім малыя? І адкуль столькі іншых «пошасцяў», калі апрацоўкі ў садзе рабіліся разоў шэсць? «Ці дозу прэпаратаў трэба было даваць большую? Ці трактар ішоў з іншай хуткасцю? Ці з тэрмінамі апрацоўкі не ўгадалі?» — ламае галаву вучоная над такой задачкай.

А я, у сваю чаргу, адзначаю: чым больш інфармацыі тут даюць, тым больш мне здаецца, што я нічога не ведаю. Ды і вопытныя садаводы пагаджаюцца, што работа з пладовымі дрэвамі — адна з самых навукаёмістых галін сельскай гаспадаркі. Ну як падгадаць з тэрмінамі апрацоўкі дрэў ад шкоднікаў, таго ж кляшча? Не паспееш спрацаваць на апераджэнне — і ўжо такога «злодзея» ў садзе не спыніць. Важна ведаць, якія дозы прэпарату і ў які час уносіць. Не забыцца восенню апрацаваць сад карбамідам. «Абавязкова перадайце чытачам, што бяліць дрэўцы трэба ўвосень, — просяць удзельнікі семінара. — Вясной гэта хіба толькі для прыгажосці, як з афарбоўкай печкі перад Вялікаднем. І не толькі ствол на метр ад зямлі важна пафарбаваць, а ўсё дрэўца».

Сёлета ў інстытут паступае шмат скаргаў на ржу грушы, пладовую гніль. Напэўна, змагацца з такімі бедамі трэба ўжо ўсім светам. Бо праблема яшчэ і ў тым, што большасць аматарскіх садоў не абразаецца. А пасля людзі скардзяцца, што на дрэвах, якія яны не абмяжоўвалі ў росце, усе грушы пагнілі, не паспеўшы нават вырасці.

Не ўбачыць ураджаю, калі не даглядаць сад, не абразаць, не ганяць шкоднікаў, не абараняць ад грыбных і бактэрыяльных захворванняў. А тут столькі нюансаў!

— У Юратэ галінкі закручваюцца, як у Кудзесніцы, і, калі няправільна абрэзаць, можна пазбавіцца ўсяго ўраджаю. Шмат залежыць ад фізіялогіі сорту. Звычайна мы абразаем аднагадовыя парасткі, але ў асобных сартоў пупышкі могуць размяшчацца менавіта на іх, часам у пачатку атожылка, а бывае — і на канцы, — расказвае Вольга Аляксандраўна. — Сярод вартасцяў маскоўскага сорту Вялеса можна згадаць, што дрэва сярэднярослае з прыгожымі таварнымі пладамі, але ў асобныя гады іх трэба падвязваць. Спакуса — ураджайная, ужо на двухгадовым дрэўцы ўсё будзе ўвешана. Расліна закладае многа пупышак, і, калі не прарваць завязь, грушкі драбнеюць. Як усе летнія сарты, доўга захоўвацца не будзе, калі ж пакласці ў холад, можа і месяц праляжаць.

Пры выбары саджанцаў абавязкова ўлічвайце, на якім яны прышчэпе. Калі вы хочаце бачыць у садзе невысокія дрэўцы (напрыклад, такія вырастаюць, калі прышчэп — айва), будзьце гатовыя, што з усё больш паўтаральнымі засухамі дагадзіць дрэўцам вельмі цяжка.

Цяпер найбольш запатрабаваныя познія сарты. І вучоныя вядуць селекцыю ў гэтым кірунку: Беларуская Завея можа захоўвацца не горш за Канферэнцыю. Сёння багата сартоў, якія даляжаць да Новага года. Так, нядаўна раянаваны старажытны французскі сорт Бэрэ Люка, створаны шэраг позніх сартоў на аснове Балгарскай прыгажуні, вартыя ўвагі некаторыя ўкраінскія і малдаўскія сарты. І дзіўна, чаму, калі існуе столькі цудоўных сартоў рознага тэрміну выспявання, людзі звяртаюцца ў сад па чаранкі састарэлых. Ну які сэнс сёння вырошчваць Дзюшэс летні — плады ў яго дробныя, уступае ў плоданашэнне на дзясяты год, да хвароб няўстойлівы.

Часам людзі каштуюць нейкія плады на рынку, а пасля загараюцца вырасціць у сябе такое ж. Але дзе гарантыя, што плады, якія вы купілі, адносяцца менавіта да пэўнага сорту? А вы пацікавіліся, дзе вырас той прадукт? Калі на поўдні — ці варта рызыкаваць і садзіць у сябе цеплалюбнае дрэўца? Яно можа падмерзнуць і як след больш будзе пашкоджвацца хваробамі, плады з яго не будуць ляжаць.

Трэба ведаць, пры якой тэмпературы захоўваць грушы і ў які час збіраць іх. Розныя сарты выспяваюць неаднолькава, ды і год на год тэрміны «гатоўнасці» на адным і тым жа дрэўцы не вытрымліваюцца. Так, сёлета грушы ў садах саспелі значна раней. Здавалася, яшчэ зусім нядаўна былі шчыльныя — мінула пару дзён і толькі паспявай здымаць. З часам вы самі зразумееце, як падысці да кожнага сорту, каб не прыпазніцца і не сабраць гнілякі, — улічыць форму, памер пладоў, пакаштаваць, паглядзець, якога колеру ў іх семкі...

Семінары, дэгустацыі, майстар-класы вучоныя праводзяць па розных культурах. На асобных занятках можна знаёміцца таксама з сакрэтамі догляду розных культур — напрыклад, зусім нядаўна тут расказвалі пра акуліроўку раслін, а кожную вясну людзей чакаюць на практыкумы па абрэзцы пладовых, костачкавых, вінаграду. Сачыце за абвесткамі на сайце Інстытута пладаводства (belsad.by). Прыязджайце па веды — не пашкадуеце.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Ну і ну!

## Падпаліў аўто, бо каханая яго кінула

**Апоўначы на лінію 102 паступіла паведамленне аб тым, што на сталічным праспекце Ракасоўскага гарыць салон аўтамабіля Renault. Супрацоўнікі Ленінскага РУУС Мінска, якія неадкладна зрэагавалі на сігнал, па гарачых слядах затрымалі падпальшчыка.**

Па інфармацыі ГУУС Мінгарвыканкама, ім аказаўся раней судзімы 61-гадовы мужчына. Ён растлумачыў, што пасварыўся са сваёй былой сужыцелькай і вырашыў ёй адпомсціць. Пад уздзеяннем алкаголю мужчына з дапамогай каменя разбіў бакавое шкло і запальнічкай падпаліў сядзенні. Пасля таго як полымя ахапіла салон аўтамабіля, мужчына ўцёк. Але далёка сысці не атрымалася — зламысніка затрымалі.

Варта адзначыць, што канцэнтрацыя алкаголю ў выдыханым паветры ў падпальшчыка склала каля трох праміле. Вядома, што раней мужчына прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за пагрозу забойствам, прычыненнем цяжкіх цялесных пашкоджанняў сваёй сужыцельцы.

Дзеянні зламысніка могуць быць кваліфікаваныя як наўмысныя знішчэнне або пашкоджанне маёмасці, здзейсненыя агульнанебяспечным спосабам, альбо якія пацягнулі прычыненне шкоды ў буйным памеры. Фігурант можа атрымаць максімальнае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам да дзесяці гадоў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Скраў індычку, варэнне і трайнік

**У адной з вёсак Шчучынскага раёна адбыўся крадзеж з хаты. Прычым зламыснік браў усё, што можна было лёгка ўзяць, абсалютна не кіруючыся прынцыпамі логікі.**

Раней судзімы мужчына 1972 года нараджэння сярод белага дня праз акно залез у хату аднавяскоўца. Гаспадара ў жыллі не было, таму няпрошаны госць адчуваў сябе вольна.

Як паведамляе УУС Гродзенскага аблвыканкама, падазраваны не шукаў нешта канкрэтнае, а браў што ўздумаецца. З халадзільніка грамадзянін дастаў літр варэння і чатыры кілаграмы мяса індычкі. У дадатак да прадуктаў харчавання зламыснік прыхапіў з разеткі электрычны трайнік і зарадныя прылады для мабільнага тэлефона.

Неўзабаве месцазнаходжанне падазраванага ў здзяйсненні крадзяжу было ўстаноўлена, выкрадзенае канфіскаванае. Зламыснік паспеў пакаштаваць толькі варэнне. У дачыненні да яго заведзена крымінальная справа па артыкуле «Крадзеж».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# АД СУДАБОЎКІ ДА УЛАДЗІВАСТОКА...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Мары здзяйсняюцца — вандроўнік з Жодзіна можа гэтым пахваліцца. Але адна рэч фатаграфаваць хітрых лемураў і хамелеонаў, іншая — людзей, якія там жывуць:

— Купілі на рынку парсюка, цыгарэт і пайшлі знаёміцца... У кожнага племені ў той жа Інданезіі (а іх там, можа, сотні) — свой лад жыцця, свае традыцыі, звычкі. Нейкае слова дзесьці мае адзін сэнс, а ў іншым месцы — зусім не такі. Трэба ўмець знаходзіць правільны кантакт з такімі людзьмі, бо нават жэстам рукі ты можаш пакрыўдзіць чалавека. І без праваднікa лепш не ісці ўвогуле.

Генадзь Канстанцінавіч сваёй прастатой, шчырасцю прыцягваў увагу мясцовых жыхароў. Аднойчы правадыр племені нават запрасіў вандроўніка ў госці — у сваю хаціну, зробленую з травы і вецця.

— Хатка ў яго была двухпавярховая, калі можна так сказаць. Вышынёй дзесьці пад два метры. На першым узроўні жонка важака спіць з дзецьмі, а мы палезлі на другі ярус. А яшчэ спецыяльна для нас мясцовыя жыхары разыгрывалі бой. Імітацыя, але па-сапраўднаму: коп'і, сякеры, крыкі. Відовішча!

Бываў Генадзь Канстанцінавіч і ў такіх плямёнах, якія ў недалёкім мінулым займаліся нават канібалізмам. Тут наш вандроўнік быў асабліва асцярожны ва ўсіх сваіх рухах і словах.

На Кіліманджара ўздымаўся з групай. Але дайшоў адзін. На гары былі тры фінішы (на розных вышынях), і далёка не ўсе адважваліся падымацца пасля першага. Генадзь Канстанцінавіч прызнаўся: «Было складана, таму што паветра на вышыні мала, адчуваецца ціск. На вяршыні снег ляжаў, а я ў тапках быў... Так! Я вандрую ў лёгкім абутку. Мне — хораша».



### З Жодзіна да Уладзівастока — за чатыры месяцы

— Першыя кіламетры маральна даваліся цяжка. Ехаў і думаў: навошта? Сядзеў бы дома, гаспадарку вёў... Але на маім шляху трапляліся людзі, самыя розныя. Яны ветліва сустракалі мяне, падтрымлівалі маральна і фінансава. Я шчыра ўдзячны ўсім, з некаторымі кантактую і цяпер.

Эканоміць даводзілася на ўсім. Купляў Генадзь Канстанцінавіч у асноўным запчасткі для транспарту. Еў ролтан — добра, калі хто частаваў нармальнай ежай. Прычына не толькі ў фінансах. Веласіпед — не машына, увесь багаж трэба цягнуць самому. Здаецца, узяў толькі неабходнае для вандроўкі, аднак вага разам з веласіпедам атрымалася каля 50 кілаграмаў. Уявіце, што гэты груз вандроўнік працягнуў праз 10 760 кіламетраў! Уздоўж Байкала ехаў амаль трое сутак, бачыў яго празрыстасць і веліч. Плюс самастойнай вандроўкі ў тым, што ў любы момант можна спыніцца і паглядзець наваколле, сфатаграфаваць. Генадзь Канстанцінавіч усё імкнуўся захаваць не толькі ў сваёй памяці, але і ў фотаапараце. Калі раптам у сопках «лавіла» мабільная сувязь — хутчэй адпраўляў СМС сям'і, якая, вядома ж, хвалявалася і чакала навін.

— Адлегласць паміж Чытой і Хабараўскам — каля 500 кіламетраў. За гэты адрэзак дарогі не трапіў ні адзін населены пункт. Былі праблемы з вадой. Але заехаў! За чатыры-пяць дзён дзесьці...

Генадзь Пузанкевіч кожны дзень імкнуўся пераадольваць не менш за сто кіламетраў. Яго сустракалі розныя людзі, многія запрашалі да сябе, частавалі абедам і здзіўляліся такой незвычайнай і нават небяспечнай ідэі. І чым бліжэйшай рабілася апошняя адметка на карце — Уладзівасток — тым сумней рабілася нашаму вандроўніку.

— Маркотна стала. Мэта амаль дасягнута, і што? Ну даеду я да Уладзіка, а потым? Такія думкі былі. На ўездзе ў горад, дарэчы, ледзь пад машыну не трапіў... А потым «адпусціла». Пасля вырашыў адлучыцца ад асноўнага маршруту, пабываў на Сахаліне і ў Саянах. Назад, у Судабоўку, дабіраўся на цягніках.

### Шэрыя квадраты Пузанкевіча

У перыяды «зацішша» Генадзь Канстанцінавіч таксама не марнуе час. Апрача жывых лебедзяў (абодвух ён называе аднолькава — Гошы), высаджаных дрэў і кустоў, прывезеных з Далёкага Усходу, можна ўбачыць чучалы дзікіх звяроў і птушак, матылёў і жукоў. Таксідэрміяй займаецца з 1974 года. І цяпер у яго майстэрні знаходзяцца экспанаты, якія трэба падлатаць, а хтосьці толькі атрымлівае тут «другое жыццё». Паўсюль матэрыялы для работы, на стале чарцяжы, лінейкі, іголкі... Пабачыўшы частку гэтага працэсу, магу сказаць, што работа досыць карпатлівая, патрабуе цярпення і вытрымкі, калі не сказаць стрыманасці.

Так, у хаце гаспадар трымае асабістага ваўка, мядзведзя, некалькіх паўлінаў і соў... Складана пералічыць, колькі застылых вачэй глядзіць на цябе з кута і сцен. Таму начных зладзеяў таксідэрмісту няма чаго баяцца! На асобнай сцяне вісяць, як кажа сам гаспадар, «шэрыя квадраты Генадзя Пузанкевіча». Пад імі тое, што баіцца сонечнага святу, тое, да чаго нельга дакранацца, і ўсё, што мы можам, — гэтаназіраць за прыгажосцю творчасці прыроды: пад «шэрымі квадратамі» захоўваецца калекцыя матылькоў з розных куткоў свету. Немагчыма выявіць найпрыгажэйшага, таму што кожны мае ўнікальную афарбоўку і форму крылаў. Акрамя матылькоў, тут жа спяць жукі розных відаў, мнаганожкі, павукі, сярод якіх я пазнала толькі тарантула...

На вуліцы — сапраўдная гаспадарка. Абыходзячы агарод, можна пабачыць горліц, якія, дарэчы, нядаўна абзавяліся птушанятамі, чаплю, фазанаў, гусей, лебедзяў і, вядома ж, курэй. У канцы немалога дварышча ёсць сажалка, якую гаспадар сам калісьці абладзіў. У пару сюды любяць прылятаць качкі.

Цяпер Генадзь Пузанкевіч працуе ў краязнаўчым гарадскім музеі. Работы шмат, і 59-гадовы вандроўнік з Жодзіна прызнаецца, што мэта паехаць на Далёкі Усход не апошняя...

**Кацярына КАСЦЕВІЧ.**



# Колькі сліны ў дзень вылучае малое дзіця,
## і іншыя «адкрыцці» Шнобелеўскай прэміі 2019 года

**29-я па ліку цырымонія ўручэння, так бы мовіць, альтэрнатывы Нобелеўскай прэміі, адбылася ў Гарвардскім універсітэце. Яе лаўрэатамі, як заўсёды, сталі 10 самых дзіўных і незвычайных навуковых прац з пацешнымі назвамі і, мякка кажучы, невідавочным практычным прымяненнем. Даследаванні, якія, як напісана ў статуце прэміі, «прымушаюць вас спачатку ўсміхнуцца, а потым задумацца».**

Пры гэтым уручаюць прэмію сапраўдныя нобелеўскія лаўрэаты. Сёлета гэта былі Эрык Маскін, які ў 2007 годзе атрымаў «нобеля» па эканоміцы, Рыч Робертс (1993, медыцына і фізіялогія) і Джэром Фрыдман (1990, фізіка). Заснавальнік узнагароды — рэдактар часопіса AIR («Аналы неверагодных даследаванняў») і нязменны вядучы цырымоніі ўручэння «Шнобеля» Марк Абрахамс — кожны год ператварае ўзнагароджанне ў камедыйнае шоу з элементамі абсурду на зададзеную тэму.



Тэма гэтага года была заяўлена як «Звычкі». Адпаведным чынам выглядаў і сам трафей, які ўручаецца лаўрэатам: кубачак для кавы, упакоўка жуйкі, цыгарэта, зубная шчотка і яшчэ некалькі прадметаў, якія сімвалізуюць тыя ці іншыя звычкі. Да яго прыкладаліся дыплом і «вельмі салідны» грашовы прыз — 10 трыльёнаў долараў. Праўда, долары былі зімбабвійскія і выдаваліся адной паперкай (на момант выпуску банкноты яе рынкавы кошт складаў прыкладна 40 цэнтаў ЗША).

Аказваецца, калі намагніціць мёртвых прусакоў, то яны значна даўжэй захоўваюць магнітныя ўласцівасці, чым жывыя. Да такой дзіўнай высновы прыйшла цэлая міжнародная каманда навукоўцаў з шасці краін — Сінгапура, Кітая, Аўстраліі, Польшчы, ЗША і Балгарыі. Напісаная па выніках гэтага займаньнага даследавання навуковая праца «Біямагнетычныя характарыстыкі жывых амерыканскіх прусакоў» была ўдастоена Шнобеля-2019 у намінацыі «Біялогія».

У намінацыі «Фізіка» прэмію атрымала даследаванне аб тым, чаму (а галоўнае — як!) вамбаты спражняюцца кубікамі. Сярод шматлікіх аўтараў гэтай міжнароднай працы апынулася пара навукоўцаў з Тайваня, Патрысія Ян і Дэвід Ху, якія сталі лаўрэатамі «Шнобеля» другі раз — упершыню за амаль 30-гадовую гісторыю ўзнагароды.

Прэмію па медыцыне атрымаў італьянец Сільван Галос, які даказаў, што ўжыванне ў ежу піцы дапамагае захаваць здароўе і знізіць рызыку смерці ад раку стрававальных органаў — але толькі ў тым выпадку, калі піца гэтая прыгатавана ў Італіі.

У намінацыі «Эканоміка» перамогу атрымалі навукоўцы з Нідэрландаў, якія вывучалі валюту розных краін у пошуках адказу на пытанне — банкноты якой дзяржавы лепш за ўсё пераносяць хваробатворныя бактэрыі. Высветлілася, што самыя брудныя — у прамым сэнсе слова — папяровыя грошы хадзяць у Румыніі.

Прэмію ў галіне медыцынскай адукацыі атрымала даследаванне, якое расказвае, як навучаць студэнтаў-медыкаў пры дапамозе гукавых сігналаў, якімі звычайна трэніруюць сабак, — накшталт цокання языком. Артыкул так і называецца: «Трэніроўка ўмоўнага рэфлексу пры правядзенні артапедычных аперацый».

Прэмія ў галіне інжынернай справы дасталася іранскаму навукоўцу Іману Фарабахшу, які запатэнтаваў апарат для змены падгузнікаў.

У намінацыі «Хімія» Шнобелеўская прэмія дасталася японскаму прафесару, які падлічыў аб'ём сліны, якую штодня вылучае сярэдняе пяцігадовае дзіця. Як расказаў сам вучоны, эксперымент ён ставіў на сваіх дзецях: узважваў бананы, даваў іх старанна разжаваць тром сваім сынам — і важыў пераджаваную масу нанова. Высветлілася, што за суткі пяцігадовае дзіця вылучае прыкладна паўлітра сліны.



Асаблівы смех у зале выклікала аб'ява лаўрэата па анатоміі. Французскія даследчыкі вывучылі тэмпературную асіметрыю некаторых частак мужчынскіх геніталій у агаленых і апранутых людзей. Яны высветлілі, што адна іх частка звычайна цяплей, чым іншая, але толькі калі на мужчыне ёсць адзенне. Вось такой праблемай зацікавіліся французскія даследчыкі, і смех залы — выдатная і якасная характарыстыка іх працы.

І, нарэшце, прэмія міру дасталася камандзе навукоўцаў з Брытаніі і Сінгапура за спробу вымераць колькасць задавальнення, якое атрымлівае чалавек, калі яму ўдаецца пачасаць месца на целе, што свярбела.

**Іван КУПАРВАС.**

## Извещение о проведении повторных открытых аукционов по продаже земельных участков в частную собственность

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 24-63-14.

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка |
|---|
| **Лот № 1.** Земельный участок с кадастровым № 221287005101000118 площадью 0,1470 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Новкинский с/с, д. Городняны, ул. Центральная, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (оз. Городно). **Нач. цена**: 3 000,00 бел. руб. **Задаток:** 300,00 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY85AKBB36003141001190000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Новкинский сельсовет) |
| **Лот № 2.** Земельный участок с кадастровым № 221282904601000221 площадью 0,1500 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Зароновский с/с, аг. Зароново, пер. Южный 1-й, уч. № 1 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона реки и водоема (оз. Княжное), придорожная полоса (контролируемая зона) автомобильной дороги. **Нач. цена**: 2000,00 бел. руб. **Задаток:** 200,00 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY53AKBB36003140600860000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа — 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Зароновский сельсовет) |
| **Лот № 3.** Земельный участок с кадастровым № 221282904601000220 площадью 0,1500 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Зароновский с/с, аг. Зароново, пер. Южный 1-й, уч. № 2 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона реки и водоема (оз. Княжное), придорожная полоса (контролируемая зона) автомобильной дороги. **Нач. цена:** 2000,00 бел. руб. Задаток: 200,00 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка**: р/с BY53AKBB36003140600860000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа — 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Зароновский сельсовет) |
| **Дата, время и место проведения повторного аукциона: 30.09.2019 в 15.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** с 16.09.2019 с 8.30 по 27.09.2019 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 08.30 до 17.30 |

Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Для участия в аукционе приглашаются граждане Республики Беларусь, консолидированные участники (двое и более граждан Республики Беларусь). Для участия в аукционе граждане РБ подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином — копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина — нотариально удостоверенная доверенность; консолидированными участниками — оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, представители граждан, уполномоченные лица (представители) — документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные в установленном законодательством порядке. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся: внести плату за зем. участок, предоставленный в частную собственность, в сумме согласно протоколу аукциона и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документации, необходимой для его проведения; в двухмесячный срок со дня проведения аукциона обратиться в РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в установленном порядке за гос. регистрацией права на зем. участок (лоты №№ 2,3), за гос. регистрацией права, ограничений (обременений) права на зем. участок (лот № 1); получить в установленном порядке разрешение Витебского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать проект на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет (лот № 1); получить в отделе архитектуры и строительства Витебского райисполкома в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство одноквартирного жилого дома (лоты №№ 2,3); в течение одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта приступить к занятию зем. участка в соответствии с целью и условиями его предоставления (лот № 1); приступить к занятию зем. участка не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома (лоты №№ 2,3); осуществить строительство объекта (одноквартирного жилого дома) в сроки, определенные ПСД; снять, сохранить и использовать плодородный слой почвы согласно ПСД. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона — участник, предложивший наибольшую цену. Победитель аукциона — участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. Конт. тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению **открытого акционерного общества «Солигорскводстрой»** (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже **здания гаража** (**здание специализированное автомобильного транспорта) площадью 503,4 кв. м, инв. № 643/С-14510**, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 623450100001003169 площадью **0,3913 га**, по адресу: Минская область, Любанский район, г. Любань, ул. Боровика 46/3**.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **74 640,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **7 464,00** бел. руб.).

**Условия продажи:**

- улучшение эстетического вида объекта, благоустройство земельного участка, отведенного для обслуживания недвижимого имущества, и наведение на нем порядка в течение трех месяцев с момента подписания акта приема-передачи недвижимого имущества;
- поддержание надлежащего санитарного, технического состояния недвижимого имущества и земельного участка в течение всего срока использования (эксплуатации) объекта до его сноса (гибели);
- обращение в течение одного месяца с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество (в случае отчуждения незарегистрированного объекта — с даты подписания акта приема-передачи) в районный исполнительный комитет для получения разрешения на разработку проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ (в случае необходимости ее разработки) либо информирование соответствующего исполнительного комитета в указанный срок об отсутствии такой необходимости;
- разработка проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ в срок не позднее 6 месяцев с момента получения разрешения, если иное не предусмотрено законодательством;
- проведение реконструкции (строительства) недвижимого имущества в сроки, предусмотренные проектно-сметной документацией, с окончанием строительства не позднее 2 лет с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество, если иное не установлено решением районного исполнительного комитета;
- использование земельного участка в строгом соответствии с действующим законодательством;
- запрет на отчуждение недвижимого имущества до его ввода покупателем в эксплуатацию.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 12.07.2019 г.

Аукцион состоится **30.09.2019** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **27.09.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, НА КОТОРОЕ НАЛОЖЕНО ВЗЫСКАНИЕ В СЧЕТ НЕИСПОЛНЕННОГО НАЛОГОВОГО ОБЯЗАТЕЛЬСТВА

Лот 1: капитальное строение, инв. № 443/С-20653 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – индивидуальный капитальный гараж), площадью 23,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Сморгонь, ул. Синицкого, 19/151, гараж, блок 5, Гаражно-строительный потребительский кооператив № 11 г. Сморгонь. Кадастровый номер 425650100001003578, площадью 2,6402 га (назначение – земельный участок для строительства и обслуживания гаражей) по адресу: г. Сморгонь, ул. Синицкого, 19.
Начальная цена продажи – **1 755** р. (одна тысяча семьсот пятьдесят пять рублей). Сумма задатка – **175** р. (сто семьдесят пять рублей). Условия оплаты — в течение 20 (двадцати) рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона.
Наименование подразделения департамента — Ошмянский межрайонный отдел управления по Гродненской области Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь.
Уполномоченный орган – ОПИ Сморгонского района. Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 55-87-70, 55-87-71

| | |
|---|---|
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 15 октября 2019 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

**Информацию о порядке регистрации и участия в аукционе, условиях и порядке проведения аукциона можно узнать по телефону 8-0152-55-87-71 или на нашем сайте** http://grodnoino.by/
**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 18.04.2017 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник — четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**
**Последний день приема заявлений — 11 октября 2019 г. до 15.00**

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## ВЕРХНЕДВИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**проводит открытый аукцион на право заключения договора аренды земельного участка, который состоится 18 октября 2019 г. в 15.00 в здании Верхнедвинского райисполкома по адресу: г. Верхнедвинск, ул. Кооперативная, 1.**

**На аукцион будет выставлен земельный участок с кадастровым номером 221050100001002388, расположенный по адресу: Витебская область, город Верхнедвинск, улица Советская, площадью 0,0106 га, в аренду сроком на 10 (десять) лет для установки торгового павильона, начальная цена предмета аукциона – 150 (сто пятьдесят) рублей 00 копеек, размер задатка – 15 (пятнадцать) рублей 00 копеек.**

**Условия продажи:** победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка обязан: внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения); возместить Верхнедвинскому райисполкому затраты на организацию и проведение аукциона; выполнить условия, предусмотренные в решении о проведении аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона; заключить с Верхнедвинским районным исполнительным комитетом договор аренды земельного участка.

**Для участия в аукционе приглашаются** граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица (далее — участники). Участнику необходимо подать заявление на участие в аукционе, заверенную копию платежного поручения о внесении задатка. Кроме того, в комиссию представляются:

- гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;
- индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;
- представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;
- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

**Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00 (перерыв с 13.00 до 14.00) с 16 сентября по 15 октября 2019 г. (включительно) по адресу: г. Верхнедвинск, ул. Кооперативная, 1, кабинет 64. Заключительная регистрация участников — 18 октября 2019 г. с 14.00 до 14.45 по тому же адресу. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.**

Сумма задатка перечисляется на р/счет BY16AKBB36043130006992100000 в ЦБУ № 206 филиала № 216 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Полоцк, BIC AKBBBY21216. Получатель – Верхнедвинский райисполком. УНП 300063038. Код платежа 4005.

Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками. Предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

На земельном участке имеются инженерные коммуникации, объекты растительного мира.

Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи.

Контактный телефон в г. Верхнедвинске 8 (02151) 62897

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению торгового унитарного предприятия «Облкоопторг» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже **здания магазина** (здание специализированное розничной торговли) **площадью 56,7 кв. м, инв. № 600/С-125584**, расположенного на земельном участке с кадастровым номером **623685810601000016 площадью 0,0446 га**, по адресу: Минская область, Минский район, Роговский с/с, д. Кукелевщина**.**

Начальная цена с НДС (20 %) — **2 480,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены — **248,00** бел. руб.). *(Начальная цена снижена на 20 %)*

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 22.06.2019 г.

